ТЭМА. **Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі. Злучальныя злучнікі, іх ужыванне**

МЭТА: спрыяць асэнсаванню вучнямі сутнасці падзелу злучнікаў на злучальныя і падпарадкавальныя, іх адрозненне ў значэнні і сінтаксічнай ролі; удасканальваць уменні адрозніваць простыя і складаныя сказы, у складаных сказах – злучальную і падпарадкавальную сувязь;

дапамагчы вучням пазнаёміцца з разрадамі злучальных злучнікаў, растлумачыць агульнае значэнне злучнікаў кожнай групы; выпрацоўваць уменні вылучаць злучальныя злучнікі ў сказах і ўстанаўліваць тыя значэнні, што яны перадаюць адпаведна кантэксту, складаць сказы з прапанаванымі злучнікавымі канструкцыямі; ужываць разнастайныя злучнікі ва ўласным вусным маўленні;

спрыяць выхаванню дабрыні, спагадлівасці ў адносінах да блізкіх, да ўсяго, што акаляе чалавека.

Тып урока: вывучэнне новага матэрыялу.

Абсталяванне: карткі з заданнямі, ацэначны ліст.

Эпіграф:

Усё праходзіць, быццам дождж няроўны, -
І боль, і злосць, і дробная брыда,
А застаецца самы важны і галоўны,
І самы светлы талент – дабрата.

С. Грахоўскі

ХОД УРОКА

**І Арганізацыйны момант**

**ІІ Праверка дамашнягя задання**

Спачатку настаўнік знаёміць вучняў з умовамі запаўнення *ацэначнага ліста (глядзі дадатак)* пасля кожнага віду працы.

1. Практыкаванне 315

*Запіс даты ў сшытак.*

2. Арфаграфічная хвілінка(3 б.)

*Пр..стыж, д..братворны, грама..скі, эст..тычны, аф..цыйны, ф..таапарат.*

Узаемаправерка

**ІІІ Актуалізацыя вывучанага на папярэднім уроку**

1. Зварот да эпіграфа

- Прачытайце эпіграф, вызначце асноўную думку.
- Чаму аўтар называе дабрыню талентам?
- Ці ўсе людзі валодаюць талентам дабрыні?
- Назавіце злучнікі, вызначце іх сэнсавую і сінтаксічную ролю.

2. Франтальнае апытванне.

- На якія дзве групы падзяляюцца часціны мовы?
- Пералічыце самастойныя і службовыя часціны мовы.
- Якія словы называюцца злучнікамі? Прыклады.
- Для чаго выкарыстоўваюцца злучнікі?
- На якія разрады падзяляюцца злучнікі паводле структуры?
- На якія разрады падзяляюцца злучнікі паводле спосабу ўжывання?
- Якія злучнікі называюцца адзіночнымі, паўторнымі і парнымі?
- У якіх стылях маўлення часцей за ўсё ўжываюцца простыя злучнікі, састаўныя?

3. Гульня “Карэктар” *(вучні працуюць у парах, робяць узаемаправерку па варыянце, прапанаваным настаўнікам)*

*Прачытайце радкі, выпраўце памылкі, звязаныя з ужываннем злучнікаў, растлумачце арфаграмы, запішыце радкі ў сшытак.*

*Паразважайце над сэнсам атрыманых радкоў, якая роля злучнікаў у разуменні сэнсу чатырохрадкоўяў? Назавіце аўтара вядомых радкоў з вывучаных раней твораў.*

| 1 варыянт | 2 варыянт |
|---|---|
| Між алеш..н, кустоў,<br>І пяе салавей,<br>Дзе шуміць, дзе гр..міць | У яго быў свет цікавы,<br>Свае вобразы, жы..ё,<br>Але (ў,у) душы яго ўсе з..явы |

| | |
|---|---|
| Срэбразво..ы ручэй. | Сваё мелі адбі..ё. |

**IV Праца па тэме ўрока**

1. Настаўнік называе тэму і мэты ўрока

2. Вучні вызначаюць вядомае і тое, чаму павінны навучыцца

| Ведаю | Хачу даведацца |
|---|---|
| | |

3. Лінгвістычны дослед

Праца ў парах. Вучні могуць карыстацца матэрыялам падручніка на с. 186,

*Настаўнік паведамляе, што вучні, працуючы ў парах, павінны будуць самастойна прыйсці да высновы аб асноўных адрозненнях злучальных і падпарадкавальных злучнікаў, зрабіўшы лінгвістычны дослед.*

Пытанні:

- Прачытайце сказы. Ці ўтвараюць яны тэкст?
- Знайдзіце і падкрэсліце злучнікі ў сказах. Што звязваюць злучнікі?
- Назавіце просты сказ, чым ён адрозніваецца ад складанага?
- Назавіце сказы, у якіх ад адной часткі да другой можна паставіць пытанне? Што можна сказаць пра адносіны паміж часткамі такіх сказаў?
- Назавіце сказы, у якіх злучнікі звязваюць аднародныя члены сказа або раўнапраўныя па сэнсе часткі складанага сказа?
- Якія знакі прыпынку вы заўважылі перад названымі злучнікамі?
- Пакажыце схематычна структуру 1-га, 3-га, 5-га сказаў. У чым адрозненне?
- Назавіце аўтара і назву вядомага вам твора, з якога ўзяты сказы.

Сказы:

1) Яно жыло, варушылася, пералівалася цераз ніжэйшы край, і імклівыя струмен..чыкі праклалі ў траве і прыбярэжным пяску раўчукі да Дзвіны.
2) П..еш крыштальнай чысціні ваду і бачыш, як глыбока на дне варуша..а жвір і камен..чыкі.
3) Стары Нічыпар казаў хлопчыкам, што памятае гэтую крынічку (з) малку.
4) Імклівымі ручайкамі пералівае..а, сц..кае з яе ў Дзвіну крыштальная вада, і магутная задумлівая рака нібы прыслухоўваецца да яе гоман.., булькат.. .
5) Пералівае..а, сц..кае па раўчуках у траве і пяск..у вада, а крынічка заўсёды поўная.
6) Бурліць і плюскоча крынічка.
7) *Прачытайце сказы, выпішыце сказы ў наступнай паслядоўнасці:*

**1 варыянт**: са злучальнымі злучнікамі, якія звязваюць часткі складаназлучанага сказа.

(1, 2, 3) **2 варыянт**: з падпарадкавальнымі злучнікамі, якія звязваюць часткі складаназалежнага сказа. (4, 5, 7) **3 варыянт**: са злучальнымі злучнікамі, якія звязваюць аднародныя члены сказа.

(3, 6, 7)

*У сказах падкрэсліце граматычную аснову, абазначце злучнікі (З – злучальныя, П – падпарадкавальныя); устаўце прапушчаныя знакі прыпынку.*

1) Сонечнымі ключамі вясна адамкнула дзверы цёплым вятрам з поўдня і яны панеслі па прасторах неўгамонную яе сілу.
2) Паблізу рос гонкі алешнік і на адным з дрэў ляжала нават прылада для іхняга гнязда але буслы аблюбавалі чамусьці руіны.
3) То шырокі разліў зары абнімаў увесь усход то вяршыні ліп палыхалі мядзяным бляскам то сады ружавелі і дыміліся празрыстым туманам.
4) Я хачу зберагчы цябе матчына песня каб запоўніць табою спусцелыя душы.
5) Дабрыня павінна асвятляць душу, яднаць людзей таму што на ёй трымаецца чалавецтва.
6) Мы зберажом усё і зуброў і чалавечнасць і старыя вежы і ўсплёскі бабра і дзіва сонечных палян і вуркатанне дзікага голуба і святую гучную цішыню Пушчы.
7) Продкамі не грэбуйце ніколі бо яны жыццём сваім, крывёю здабывалі і зямлю і волю.

5. Зварот да сказаў пад № 1, 2, 3.

- Якія сэнсавыя адносіны паміж часткамі СЗЛС дапамагаюць выразіць адзначаныя злучнікі?

Вывад: злучальныя злучнікі выражаюць спалучальныя, супраціўныя, размеркавальныя адносіны.

Фізкультхвілінка

6. Чытанне тэарэтычнага матэрыялу падручніка на с. 181. Складанне схемы ў канспект.

**V Праверка разумення вучнямі новага матэрыялу**
1. Практ 320.

Хвіліна адпачынку

Настаўнік: дабрыня і зло – гэта якасці, якія сустракаюцца не толькі ў чалавека, але і паўсюль у прыродзе. Так, ёсць грыбы “добрыя”, якія можна ўжываць у ежу, і “злыя”, якія могуць атруціць чалавека.
- Якія грыбы ведаеце?
- Стварыце сказы са словамі *за тое, затое. (Людзі любяць баравікі за тое, што яны вельмі смачныя. Мухамор – ядавіты грыб, затое як цудоўна ён выглядае!)*
3. Практыкаванне 321. *калектыўная параверка, па два сказы кожнаму варыянту)*

**VI Замацаванне новага матэрыялу**
Рознаўзроўневыя заданні

| 1 варыянт | 2 варыянт |
|---|---|
| **1-2 б. Дапішы.** Па значэнні злучальныя злучнікі падзяляюцца на тры групы: спалучальныя супраціўныя, … | **1-2 б. Дапішы.** Па значэнні злучальныя злучнікі падзяляюцца на тры групы: размеркавальныя, супраціўныя, … |
| **3-4 б. Запішы сказ, падкрэслі злучнік, вызнач разрад па значэнні.** То знікне, то выблісне сонца ўгары. | **3-4 б. Запішы сказ, падкрэслі злучнік, вызнач разрад па значэнні.** Праходзіць ноч, і меркнуць зоры. |
| **5-6 б. Устаў у сказ злучнік, вызнач разрад па значэнні і ролю ў сказе. Запішы сказ.** Моцна кахаў я цябе, дарагая, … расстацца нам час. | **5-6 б. Устаў у сказ злучнік, вызнач разрад па значэнні і ролю ў сказе. Запішы сказ.** З гэтай пары я пачаў углядацца ў неба начное … зорку шукаў. |
| **7-8 б. Як адрозніць злучнік *затое* ад спалучэння прыназоўніка з займеннікам *за тое*? Прывядзі прыклад, запішы сказ.** | |
| **9-10 б. Складзі і запішы тры сказы са злучальнымі злучнікамі (выкарыстай спалучальныя, супраціўныя і размеркавальныя злучнікі).** | |

Самаправерка

**VII Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**
2) Вернемся да задач урока.

- Ці на ўсе пытанні мы адказалі?

- Што было для вас карысным на ўроку?

- Які від работы выклікаў цікавасць і задавальненне?

**VIII Дамашняе заданне**
Параграфы 48, практыкаванне322.